Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

*Гістарычны факультэт*

*Кафедра славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі*
*Кафедра гісторыі Беларусі*

***Да 90-годдзя ўтварэння БССР***

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
*г. Мінск, 27 лютага 2009 г.*

У дзвюх частках

Частка 1

## *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да 1918 г.*

Мінск 2009

# ПОШУК ШЛЯХОЎ СТВАРЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА АКУПІРАВАНЫХ ГЕРМАНІЯЙ ЗАХОДНІХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (верасень 1915 – люты 1917 гг.)

***М.В. Цуба, ПДУ, г. Пінск***

Барацьба за самастойнасць і незалежнасць далёка не заўсёды залежыць ад жаданняў ...родаў. Тут неабходна ўлічваць міжнароднае становішча, рашэнні вялікіх дзяржаў і іх вайсковую ...ысутнасць на тых ці іншых тэрыторыях, прыхільныя ці варожыя адносіны суседзяў і г. д. У ...рыяд Першай сусветнай вайны Беларусь знаходзілася ў значна горшых умовах, чым суседнія

народы. У той час, калі частка украінцаў і палякаў карысталася пэўнай аўтаноміяй пад Аўстра-Венгрыяй (меліся пачатковыя школы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя установы з роднай мовай навучання, навуковыя кадры, нацыянальныя сродкі інфармацыі і г. д.) беларусы пад Расійскай імперыяй не мелі падобных правоў на развіццё сваёй нацыянальнай думкі. Беларускі народ не меў дастаткова ведаў аб сабе, як беларусах, аб палітычным мінулым свайго края, яго гісторыі і культуры.

І усё ж, нягледзячы на цяжкія умовы існавання, на сваю слабасць, беларусы захоўвалі пачуццё сваёй адметнасці і этнаснай асобнасці. У гады вайны, калі заходнія палітыкі ці карэспандэнты пыталі ў беларусаў хто яны, то чулі адказы: «тутэйшыя».

Вайна несла велізарныя страты фізічным сілам беларускага народа, але разам з тым паскарала грамадска-палітычнае абуджэнне, рост яго нацыянальнай самасвядомасці. «Ёсць надзея, што страшэнная вайна, аб якой яшчэ ўнукі нашы будуць успамінаць, такі збудзіць ад сну вялікую грамаду вясковых людзей» [1, с. 2] – пісала ў гэтыя дні «Наша ніва». І хаця рэдакцыя газеты «Наша ніва» (фактычна кіраўніцтва Беларускай сацыялістычнай грамады), абмяжоўвалася ў выпадку паражэння Расійскай імперыі дасягненнем аўтаноміі беларускага народа, усё ж гэта была толькі першачарговая задача, якая вяла затым да рэальнага дзяржаўнага суверэнітэту.

Восенню 1915 года Беларусь у выніку ваенных паражэнняў расійскай арміі была падзелена на дзве часткі: заходнюю (Гродзенская, большая частка Віленскай і частка Мінскай губерняў), акупіраваную германскімі войскамі, і ўсходнюю.

У занятай нямецкімі войскамі Вільні засталася невялікая група актыўных беларускіх нацыянальных дзеячаў на чале з братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Алаізай Пашкевіч-Кайрыс (Цёткай), Вацлавам Ластоўскім і інш. Менавіта яны ўвайшлі з беларускага боку ў так званы Віленска-Ковенскі камітэт, створаны з прадстаўнікоў палякаў, літоўцаў, беларусаў і яўрэяў, якому адступіўшыя расійскія улады перадалі кіраванне горадам. «Камітэт гэты меў спаўняць абавязкі Летувіска-Беларускага ўрада ў часе нямецкай акупацыі. Цікава тое, што расейскі губернатар Вяроўкін зацвердзіў гэты Камітэт перад эвакуацыяй з Вільні і перадаў яму ўладу. Дадзены факт можна лічыць за гістарычны акт уступства царызму на карысць мясцовага насельніцтва» [2, с. 58–59]. У хуткім часе гэты камітэт быў рэарганізаваны, а на яго базе стварыліся народныя камітэты з прадстаўнікоў тых жа нацыянальнасцей, якія мелі самастойнасць і большую, чым раней колькасць членаў. Арыентуючыся на Захад (цэнтральнаеўрапейскія краіны), дзеячы народных камітэтаў паставілі на мэце аднавіць незалежнае Вялікае княства Літоўскае, а дакладней, «незалежнасць Літвы і Беларусі абыймаючы літоўскія і беларускія землі, злучаныя эканамічнымі варункамі і супольнымі палітычнымі жаданнямі» [3]. Пасля заявы канцлера Германіі Бетман-Гольвега, што «вызваленыя з-пад Расіі землі не вернуцца назад пад маскоўскае ярмо» [4, с. 21], па ініцыятыве дзеячаў Беларускага народнага камітэта (БНК) (Камітэт дарэчы падтрымліваў сувязі з літоўскім, польскім і яўрэйскім нацыянальным рухам для забеспячэння тэрытарыяльнай цэласнасці і непадзельнасці беларускіх зямель, а таксама прадстаўляў і абараняў інтарэсы беларускага насельніцтва перад акупацыйнымі ўладамі), у канцы 1915 г. была дасягнута дамова аб устанаўленні ў будучай дзяржаве канфедэратыўнага ладу для ўсіх чатырох нацыянальнасцей краю. Дадзеная згода была заканадаўча замацавана Універсалам, які быў выдадзены на чатырох мовах Часовай радай канфедэрацыі ў снежні 1915 г. У адпаведнасці з гэтым дакументам на землях Літвы і Беларусі меркавалася стварыць незалежную краіну з сеймам у Вільні, выбраным у выніку агульных роўных і прамых выбараў пры тайным галасаванні з забяспячэннем правоў нацыянальных меншасцяў. У межы канфедэрацыі ўключаліся землі, акупіраваныя ў той час германскімі войскамі: Ковенская і Віленская губерніі, беларуская і літоўская часткі Гродзенскай і Сувалкскай губерняў, літоўская частка Курляндскай губерні і частка Мінскай губерні, звязаная з віленскім цэнтрам. Форма дзяржаўнага ладу і канстытуцыя падлягалі зацвярджэнню на Устаноўчым сейме ў Вільні [5, с. 39–40].

Але сама ідэя ўзнаўлення Вялікага княства Літоўскага нават на той час была ўжо з разраду мінулага, аджыўшага свой век. Таму яна не знайшла шырокай падтрымкі ні сярод беларускага насельніцтва, ні сярод літоўскага, не кажучы ўжо пра іншыя нацыянальнасці. Да таго ж літоўцы баяліся, што ў супольнай беларуска-літоўскай дзяржаве яны могуць быць падвергнуты асіміляцыі беларускай большасцю, згодна з падлікамі Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны «пад уладай Германіі аказалася каля 1 мільёна 500 тысяч беларусаў» [6]. Па гэтай прычыне літоўцы больш клапаціліся аб стварэнні сваёй самастойнай краіны, знаходзячы ў гэтым шырокую падтрымку з боку нямецкіх ваенных улад. Акрамя таго, былі прапановы некаторых мясцовых дзеячаў, якія заклікалі беларусаў і літоўцаў да федэрацыі Беларусі і Літвы Польшчай.

тага паляки вялі змаганне з беларускім і літоўскім уплывам, пашыраючы паланізацыю на разглядаемай намі тэрыторыі.

Праблемам міжнацыянальных адносін беларусаў і палякаў прысвечана аналітычная запіска Антона Луцкевіча, адрасаваная нямецкім акупацыйным уладам. У якой А.Луцкевіч адзначыў, што палякі заўсёды бачылі ў беларускім нацыянальным руху рэальную пагрозу польскай экспансіі і таму вялі барацьбу супраць яго. Самай небяспечнай з польскага боку для беларусаў ён лічыў дзейнасць «польскай большасці каталіцкага кліру», а таксама імкненне польскіх дзеячаў «надаць краю (маецца на ўвазе Вільня) чыста польскі характар і канчаткова праглынуць беларусаў, якіх не здолелі дэнацыяналізаваць за 143 гады знаходжання пад уладай Расіі» [7]. Па сведчанню А. Луцкевіча, асабліва пасля заявы графа Пфайля, які назваў Вільню «польскім горадам», сярод польскіх дзеячаў распачалася сапраўдная «нацыяналістычная вакханалія». Мясцовае гарадзянскае самакіраванне, якое складалася з палякаў «пачало праводзіць поўны байкот беларусаў у горадзе, адмовілася друкаваць свае абвесткі па-беларуску». Аўтар запіскі характарызаваў як працяг палітыкі паланізацыі – масавае адкрыццё польскіх школ у Вільні і прылягаючых мясцовасцях, куды запрашаліся вучыцца дзеці беларусаў-каталікоў. Акрамя таго А.Луцкевіч абвінавачваў агітацыю польскай грамадскасці ў адносінах да беларусаў-каталікоў запісвацца падчас правядзення перапісу 1916 года «палякамі» [8].

Разам з усімі прыведзенымі вышэй аргументамі, неабходна адзначыць, што ў планы германскага ўраду не ўваходзіла ні стварэнне незалежнай беларуска-літоўскай дзяржавы, ні тым больш федэрацыі Беларусі і Літвы з Польшчай. Кайзераўская Германія і сама была не супраць замацаваць сваю ўладу на захопленых тэрыторыях. Да таго ж падзел на народныя камітэты быў naспадобы немцам, якія выкарыстоўвалі яго для сваіх мэт і праводзілі на захопленых землях разрушніцкую палітыку. Акаталічаным беларусам, якіх называлі палякамі, абяцалі адраджэнне Польшчы, а беларусам і літоўцам – разгледзець пытанне аб утварэнні іх дзяржавы. У адозве акупацыйных улад да жыхароў Вільні, падпісанай графам Пфайлем, гаварылася, што «нямецкія войскі шчыра спачуваюць польскаму насельніцтву» [9, с. 264], а ў лісце да генерала Людэндорфа рэкамендавалася яму «каб вялося змаганне з польскімі ўплывамі і каб падтрымліваліся іншыя нацыянальнасці (літоўцы, беларусы, яўрэі)» [9, с. 264]. Менавіта такая палітыка германскіх акупацыйных улад прывяла народныя камітэты да ўнутраных спрэчак у сувязі з невызначанасцю пытання па той частцы Беларусі, дзе пераважалі каталікі. Гэтая спрэчка ў рэшце рэшт скончылася распадам самой канфедэрацыі.

Разбурыўшы канфедэрацыю, нямецкія ўлады ў сваю чаргу прынялі адпаведныя меры па прадухіленні паглынання Беларусі Польшчай. Паводле загаду галоўнакамандуючага германскім фронтам фельдмаршала фон Гіндэнбурга ад 16 студзеня 1916 года беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай, і мела правы ўжытку ў грамадскім, культурным, асветным, і адміністрацыйным жыцці [10, с. 40].

Выкарыстоўваючы спрыяльны момант беларускія дзеячы імкнуліся парушыць тоеснасць паняццяў «паляк» і «каталік», «рускі» і «праваслаўны», якая негатыўна ўплывала на фарміраванне нацыянальнай свядомасці. З гэтай мэтай яны дамагаліся шырокага выкарыстання беларускай мовы ў рэлігійным жыцці, у першую чаргу ў касцёльным і царкоўным набажэнстве. Нягледзячы на тое, што значная частка польскай грамадскасці абуралася такімі патрабаваннямі, усё ж намаганні беларусаў далі пэўны плён – пачалі выдавацца кнігі каталіцкага набажэнства на беларускай мове. Сярод якіх асаблівай папулярнасцю карыстаўся малітоўнік «Бог з намі». Яго аўтарам быў Балеслаў Пачобка, а мецэнатам выдання стала княгіня Марыя Магдалена Радзівіл. Гэтая кніга і іншыя выданні на беларускай мове атрымалі пазітыўную ацэнку з боку некаторых каталіцкіх біскупаў [11, с. 352].

Разам з кнігадрукаваннем, дзякуючы новаму беларускаму выдавецтву, пачала адраджацца і беларуская перыёдыка. З 15 студзеня 1916 г. пад рэдакцыяй Вацлава Ластоўскага ў Вільні двойчы на тыдзень стала выходзіць беларуская газета «Гоман». На яе старонках змяшчаліся распараджэнні акупацыйных улад, вялася барацьба з польскім засіллем, шмат месца адводзілася пад літаратурныя творы і гісторыка-публіцыстычныя матэрыялы. Засяроджваючы ўвагу на асветніцкіх і грамадска-выхаваўчых функцыях беларускай літаратуры ў культурна-нацыянальным адраджэнні беларускага народа, газета змяшчала творы – Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, М. Гарэцкага, З. Бядулі, А. Гаруна, А. Гурло, Ц. Гартнага, Я. Баршчэўскага, А. Абуховіча і інш.

Нямецкія акупацыйныя ўлады, якія далі дазвол на рэдагаванне газеты, у далейшым не перашкаджалі яе выданню, хаця «Гоман» актыўна выступаў за стварэнне незалежнай Беларускай

рэспублікі або федэратыўнага «Беларуска-Літоўскага краю». «Гасударства, як форма бытавання народу, – пісалася ў «Гомане» – можа быць знішчана, разбіта, ды яно ў канцы канцоў адбудуецца нанава: калі толькі сам народ захаваў у сабе іскру жыцця, творчую сілу!» [12, с. 2].

Лічачы найвышэйшай каштоўнасцю для «вольнага грамадзяніна» нацыянальную незалежнасць, «Гоман» сваімі публікацыямі падводзіў беларускае насельніцтва да ўсприняцця гэтага: «Край, каторы жыў калісь самабытным, незалежным жыццём, каторы мае свой асаблівы ўклад жыцця, утвораны сталеццямі, – гэта незвычайны шматок зямлі, – напамінала газета акупантам. Край наш – той жывы арганізм; ён мае свае асобенныя патрэбы, мае адвечныя ідэалы шчаснага існавання, мае жаданні, якія тутэйшае грамадзянства, звязанае неразрыўна з нашай зямлёй, выказвала ў даволі яркай форме як калісьці, так і цяпер – у часы вайны» [13, с. 1].

Уважлівы аналіз публікацый на старонках «Гомана» сведчыць пра тое, што яго погляды, накіраванасць і гістарычныя ацэнкі тых ці іншых падзеяў мінуўшчыны прынцыпова не разыходзіліся з пазіцыяй газеты «Наша ніва».

Адной з галоўных задач «Гомана», як у свой час і «Нашай нівы» была мэта – выхаваць сярод беларусаў веру ва ўласныя сілы.

Лаяльнасць нямецкіх вайсковых улад да газеты можна растлумачыць тым, што Германія, хоць і была супраць стварэння незалежнай беларускай дзяржавы на захопленых ёй землях, усё ж не магла не заахвочваць тыя сілы, якія імкнуліся да паслаблення расійскага ўплыву ў дадзеным рэгіёне. Разам з тым нямецкія ўлады, будучы не зацікаўленымі і ў стварэнні незалежнай беларуска-літоўскай дзяржавы, але і няздольныя германізаваць захопленую тэрыторыю, вымушаны былі даць выхад выбуховай нацыянальна-вызваленчай энергіі народаў, кантралюючы і накіроўваючы яе ў асноўным на нацыянальна-культурнае і асветнае рэчышча. Тым не менш, такая пазіцыя з боку германскіх улад давала поўную свабоду дзейнасці беларускаму нацыянальнаму руху разам з газетай «Гоман».

Важным крокам на шляху станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларусаў трэба лічыць іх настойлівыя намаганні любой цаной выйсці ў якасці самабытнага народа на міжнародную палітычную арэну. На пачатку 1916 г. у Вільні быў створаны «Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый», які накіраваў сваіх прадстаўнікоў на міжнародную канферэнцыю ў Стакгольм [9, с. 265]. 9 мая 1916 г. дэлегаты гэтага саюза на дадзенай канферэнцыі В. Ластоўскі і Я. Салавей разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, што насялялі Расійскую імперыю, падпісалі тэлеграму на імя прэзідэнта Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў В. Вільсана [14]. У гэтай тэлеграме, звернутай да амерыканскага прэзідэнта, як «галоўнага барца за гуманнасць і справядлівасць», даводзяцца факты аб «цяжкай долі» іншародцаў, пражываючых на тэрыторыі Расійскай імперыі, а таксама праз прэзідэнта В. Вільсана робіцца зварот і да саюзнікаў Расіі ў вайне з надзеяй, што яны змогуць некалькі аблегчыць «невыносныя мукі» расійскіх нацыянальных меншасцяў [14]. Праз месяц беларусы зноў загаварылі ўласным голасам на міжнароднай палітычнай арэне. На гэты раз яны выкарысталі трыбуну арганізаванага «саюзам Нацыянальнасцяў» III Кангрэса нацый, што праходзіў 11 чэрвеня 1916 г. у Лазанне (Швейцарыя) [15, с. 7]. Беларуская дэлегацыя на чале з В. Ластоўскім прадставіла тут мемарандум, у якім былі сфармуляваны палітычныя патрабаванні беларускага нацыянальнага руху, складзеныя на аснове рэферата, выпрацаванага БНК на чале з А. Луцкевічам «Злучаныя штаты ад Балтыі да Чорнага мора».

Паводле канцэпцыі гэтай працы, пасля Першай сусветнай вайны меркавалася стварыць эканамічны і палітычны блок, куды б увайшлі незалежныя Беларусь, Літва, Латвія і Украіна [16, с. 438]. З галоўнай прамовай ад беларусаў на гэтым Кангрэсе выступіў І. Луцкевіч. Ён заявіў, што «Ужо каля году, як арміі расійская і нямецкая б'юцца на землях Беларусі і Украіны, і люд гэтых старонак мусіць цярпець усе жахі вайны, будучы выстаўлены на поўнае руйнаванне яго эканамічнага быту і спыненне культуры» [17, с. 224]. Акрамя таго, у яго выступленні выразна прагучала нежаданне жыць пад прыгнётам Расійскай імперыі, падкрэслівалася асаблівая роля ў палітычнай гісторыі беларускага народа наяўнасці такіх яго дзяржаў, як Полацкае і Вялікае княства Літоўскае. Далей гаварылася: «Цяпер дзякуючы III канферэнцыі народаў, мы маем магчымасць першы раз за 120 гадоў заявіць цывілізаванаму свету аб поўнай нашай бясспраўнасці, ад якой мы пакутавалі ў Расейскай дзяржаве. Мы просім у цывілізаваных народаў спагады нам і падтрымання, каб прымусіць да пашаны нашых нацыянальных і культурных правоў. Мы можам урэшце спадзявацца, што, які б не быў канец вайны, народы Еўропы памогуць нам забяспечыць Беларусі палітычныя і культурныя правы, якія дадуць нашаму народу магчымасць вольна развіваць свае інтэлектуальныя, маральныя і эканамічныя сілы, і што гэтыя правы дадуць нам магчымасць стаць гаспадарамі нашай уласнай зямлі» [4, с. 23].

Але ўрады краін Антанты, да якіх звярталіся беларускія дэлегаты, не пайшлі насустрач. Ім патрэбна была Расійская імперыя, якая б і далей працягвала вайну з Германіяй і яе саюзнікамі. Таму «яны поўнасцю падтрымалі вялікадзяржаўныя імкненні расійскай буржуазіі» [18, с. 45]. Такім чынам, упэўненасць, што прагрэсіўныя сілы Еўропы з павагай паставяцца да палітычных правоў беларусаў, аказалася марнай.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці, работа ў плане кансалідацыі беларускіх грамадска-палітычных сіл працягвалася. Беларускі народны камітэт (старшыня А. Луцкевіч) разам з пачаўшым функцыяніраваць з 1916 г. Цэнтральным саюзам беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый аб'ядналі ў сваіх радах усе беларускія палітычныя, грамадскія і прафесійныя арганізацыі на акупіраванай Германіяй тэрыторыі Беларусі. У гэтыя каардынацыйныя органы ўваходзілі прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групы (БСДРГ), Хрысціянскай злучнасці, Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, Віленскага камітэта Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі (СН і НБ). Апошняя арганізацыя на чале з В.Ластоўскім была не толькі супраць краёвай аўтаноміі ў складзе Расіі альбо Польшчы, але лічыла непрымальнай і канфедэрацыю з Літвой. Яна паставіла сваёй галоўнай мэтай «стварэнне незалежнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах» і выступала за вольную дэмакратычную рэспубліку Беларусь [19]. Аб рашучых выступленнях СН і НБ супраць якіх-небудзь спроб утварыць Беларускую дзяржаву разам з іншымі суседзямі чытаем у «Гомане»: «Мы ўсё яшчэ шукаем нейкай чужой арыентацыі: то звязываем свой быт і сваю долю з маскалямі, то з Польшчай, – а тым часам у нас можа і павінна быць толькі адна свая беларуская, краёвая арыентацыя, як у маскалёў – маскоўская, а ў палякаў – польская» [20, с. 2]. Спасылаючыся на недахоп пачуцця «нацыянальнай гордасці» не толькі ў «цёмных беларускіх сялян, але і ў большасці інтэлігенцыі ў самы адказны палітычны момант, калі вырашаецца будучыня народа і нас Бацькаўшчыны», асабліва падкрэсліваецца, што «такое становішча не толькі не гожэ прадстаўнікам 9 мільённага народу, але і шкодна для ўсёй беларускай справы, для будучыні нашага Краю» [20, с. 2].

Ёсць падставы меркаваць, што СН і НБ была створана прадстаўнікамі розных віленскіх беларускіх арганізацый. Але пераважалі ў ёй найбольш блізкія па духу да гэтай арганізацыі былыя члены Хрысціянскай злучнасці, актыўным дзеячам якой з'яўляўся і сам В. Ластоўскі. Пацвярджэннем гэтаму можа служыць наступная заўвага А. Грыцкевіча, што «ў гэтую арганізацыю ўваходзілі ў асноўным прадстаўнікі каталіцкага духавенства, а таксама князь М.М. Святаполк-Мірскі. Праз іх былі ўстаноўлены сувязі з нямецкай каталіцкай партыяй цэнтру» [21, с. 113]. Відаць, яны яшчэ звязвалі пэўныя спадзяванні вырашыць справу беларускай дзяржаўнасці з нямецкай дапамогай. Ва ўсякім выпадку дзеячы СН і НБ імкнуліся выкарыстаць усе магчымасці і шанцы, каб дамагчыся ажыццяўлення сваёй мары – незалежнасці Беларусі. Але германскі бок адносна беларусаў абмяжоўваўся ў асноўным дазволам правядзення культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў і не даваў ніякіх падстаў спадзявацца на нешта большае.

Адначасова з актывізацыяй дзейнасці, накіраванай на стварэнне незалежнай беларускай дзяржаўнасці, прадпрынятай СН і НБ, адбыліся некаторыя зрухі і ў працы БНК. Беларускі народны камітэт у канцы 1916 г., прытрымліваючыся свайго ранейшага пункту гледжання па аднаўленні дзяржаўнасці, наладзіў новыя перамовы ў Вільні з літоўскім камітэтам з мэтай «высветліць асновы супольнага дзяржаўнага жыцця Беларусі і Літвы» [5, с. 41]. Аднак ужо на самым пачатку 1917 г. літоўскія прадстаўнікі адмовіліся ад далейшага працягу гэтых перамоў. І па рэкамендацыі Германіі канчаткова парываюць сувязі не толькі з БНК, але таксама з польскім і яўрэйскім нацыянальнымі цэнтрамі, ствараючы ў Вільні Літоўскую дзяржаўную раду (Тарыбу) як вярхоўны орган Літвы [5, с. 41 – 42]. У склад новастворанай Літоўскай дзяржавы павінны былі адыйсці і акупіраваныя Германіяй беларускія землі. Мабыць па гэтай прычыне «...нямецкія ўлады заявілі, што ў Тарыбу акрамя літоўцаў павінны ўвайсці і беларусы» [22, с. 80]. Стараючыся не пярэчыць акупацыйным нямецкім уладам, літоўцы вымушаны былі вылучыць усяго два месцы для беларускіх прадстаўнікоў [18, с. 45]. Такім чынам, літоўская Тарыба, што ўтварылася на пачатку 1917 г. пры непасрэднай падтрымцы Германіі, абвясціла сябе дзяржаўным цэнтрам Літвы, і «беларусы нямецкай акупацыі ўваходзяць у яе ў якасці прадстаўнікоў падначаленай народнасці» [23, с. 469]. Такі паварот падзей некалькі працверазіў дзеячаў усіх беларускіх грамадска-палітычных арганізацый, якія знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй, што выразна выявілася ў скліканні 25–27 студзеня 1917 г. у Вільні супольнай канферэнцыі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху. Вядома, што дадзеная канферэнцыя праходзіла пад лозунгам, выстаўленым арганізацыяй Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі: «Мы хочам быць незалежныя ў сваіх

этнаграфічных межах!». У ходзе яе насуперак літоўскай Тарыбе была створана Віленская Беларуская Рада на чале з Антонам Луцкевічам [24, с. 104].

Нягледзячы на асобныя недахопы і памылкі, усё ж неабходна адзначыць, што паслядоўныя і рашучыя крокі, зробленыя беларускімі дзеячамі ў вырашэнні шматлікіх пытанняў, звязаных з нацыянальнымі інтарэсамі беларусаў, што знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй, а таксама ў справе аднаўлення дзяржаўнасці сваёй бацькаўшчыны, заслугоўваюць увагі і пашаны.

У беларускім грамадстве падчас Першай сусветнай вайны з'явіліся тыя свядомыя нацыянальныя сілы, якія пры спрыяльных варунках маглі прывесці да беларускай дзяржаўнасці.

Патрэбна адзначыць, што беларускі нацыянальны рух паступова набіраў моц, пашыраючы сваю дзейнасць, як на тэрыторыі беларускіх зямель, так і сярод бежанскіх мас параскіданных па ўсёй Расійскай імперыі. Напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі ён стаў дамінуючым на нашых землях. Абвясціўшы лозунг ад устанаўлення беларускай дзяржаўнасці ў выглядзе тэрытарыяльнай і нацыянальна-палітычнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі на пачатку вайны да палітычнай незалежнасці Беларусі, Літвы ў 1915 годзе, Беларусі як самастойнага суб'екта ў саюзнай дзяржаве – Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны і Польшчы ў 1916 годзе (Чарнаморска-Балтыйская канфедэрацыя), і Беларусі «незалежнай у сваіх этнаграфічных межах» на пачатку 1917 года (Віленская канферэнцыя прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху 25–27 студзеня 1917 г.). Менавіта гэтымі эвалюцыйнымі крокамі ў беларускім пытанні быў закладзены той падмурак, які ў будучым прывядзе да дзяржаўнага суверэнітэту.

*Літаратура*


1. Вайна-школа для вяскоўцаў // Наша ніва. – 1914. – 5 снежня.
2. Весялкоўскі Ю. Беларусь у першай сусветнай вайне //Беларускі сьвет (Англія). – 1983, № 14. – С. 32–59.
3. БДАМЛІМ. Ф.3, воп.1, с. 139, арк.19.
4. Турук Ф. Белорусское движение. Очерк национального и революционного движения белорусов. – М.: Госиздат 1921. – 145 с.
5. Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. – Минск: Наука и техника 1986. – 344 с.
6. БДАМЛІМ. Ф.3, воп.1, с. 131, л. 1.
7. БДАМЛІМ. Ф.3, воп.1, с. 12.
8. БДАМЛІМ. Ф.3, воп.1, с. 16.
9. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: Вучэбны дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 1992.- 270 с.
10. Калубмовіч А. Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны. – Беласток: Га Макс; Вільня: Наша ніва; Менск: Маст. літ., 1993. – 288 с.
11. Смалянчук А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. – СПб.: Неўскі прасцяг; 2004. – 406 с.
12. Мялешка І. Аснова быту //Гоман. – 1916. – 14 лістап.
13. Мялешка І. Напамінанне //Гоман. – 1916. – 19 снеж.
14. НАРБ. Ф. 2499, воп. 1, с. 299, л.л 2–5.
15. Луцкевіч А. Злучаныя штаты ад Балтыкі да Чорнага мора // Свабода. – 1990, N 2. – крас.
16. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск: Бел.Эн., 1993. – Т.1./ Рэдкал.: Біч М.В. і інш. – 1993. – 494 с.
17. Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця: Лекцыі чытаныя студэнтам БДУ. – Менск: Дзярж. выд-ва, 1925. – 252 с.
18. Сташкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925). – Минск: Университетское, 1985. – 304 с.
19. НАРБ. Ф. 60, воп. 3, сС 81, Л. 43.
20. Мялешка І. Сіла наша – у нас самых // Гоман. – 1916. – 15 верас.
21. Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / Пасляслоўе Грыцкевіча А. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – 126 с.
22. Станкевіч А. Да гісторыі Беларускага палітычнага вызвалення.- Вільня: Шлях моладзі, 1934. – 128 с.
23. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск: Бел. Эн., 1994. – 510 с.
24. Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. – Мінск: Вышэйш.. шк., 1994. – 318 с.